ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (763) ● Пятніца, 28 лістапада ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

КАНФЕРЭНЦЫЯ МАЛАДЫХ

Ва універсітэце завяршыла работу рэспубліканская навуковая канферэнцыя маладых вучоных па грамадскіх навуках, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

У рабоце секцый гісторыі КПСС, дыялектычнага, гістарычнага матэрыялізму, гісторыі філасофіі і права, палітычнай эканоміі, навуковага камунізма прынялі ўдзел аспіранты і маладыя выкладчыкі БДУ, Гомельскага універсітэта, Мінскага педагагічнага і інстытута замежных моў, Магілёўскага, Гродзенскага, Віцебскага педагагічных інстытутаў, Беларускага інстытута фізкультуры, БПІ, інстытута народнай гаспадаркі і іншых вышэйшых навучальных устаноў.

Шырокае кола пытанняў, актуальнасць тэматыкі, высокая навуковая каштоўнасць узнятых праблем выклікалі вялікую зацікаўленасць да гэтай канферэнцыі.

В. АРЛОЎ.

У Мінску 20 лістапада адбыўся заключны канцэрт інтэрнацыянальнага фестывалю замежных студэнтаў, якія навучаюцца тут. Ён прысвячаўся 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Амаль ва ўсіх жанрах дэманстравалі сваё майстэрства в'етнамскія студэнты. Граматай фестывалю адзначан танцавальны калектыў БДУ.

НА ЗДЫМКУ: в'етнамскія студэнты з БДУ выконваюць свой нацыянальны танец (злева) і беларускую «Бульбу» (унізе).
Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

СЕСІЯ ПРЫСПЕШВАЕ

На лесвіцы новага хімічнага корпуса мяне абагнала студэнтка ў белым халаце, пасля другая. Міжволі пайшла ўслед за імі. Ля адной з аўдыторый мітусіліся студэнты ў такіх жа белых халатах. Рэзкі спецыфічны пах лепш за словы гаворыць аб тым, што тут ідуць лабараторныя заняткі.

На пытанне, як ідуць справы ў другакурснікаў, камсорг групы Лена Смелякова з задавальненнем паведаміла:

— На камсамольскім сходзе курса адзначылі, што трэцяя група займае першае месца як па дысцыпліне, так і па паспяховасці сярод іншых груп першага патоку.

— Прычым такія студэнткі,—дапаўняе Ніна Кудзеля.—як Іна Кастрыца і Таня Калевіч займаюцца толькі выдатна, яны атрымліваюць павышаную стыпендыю. Ды і ўвогуле ў нашай групе большасць студэнтаў займаецца на добра і выдатна.

— І хоць у першы час цяжка, таму што няма магчымасці карыстацца неабходнымі рэактывамі, — адзначыла выкладчык Таіса Паўлаўна Бабаеўская, — студэнты ўсё ж старанна рыхтуюцца да сесіі і імкнуцца ўтрымліваць першынство.

— Займацца трэба вельмі многа, а тут яшчэ не хапае падручнікаў, — расказвае Лена, — тры-пяць на групу ніяк не могуць задаволіць патрабаванні ўсіх. Многія позна заседжваюцца ў чытальных залах.

Набліжэнне сесіі адчуваюць і студэнты, і выкладчыкі і стараюцца як можна лепш выкарыстаць вучэбны час.

В. РАДКЕВІЧ,
студэнтка.

ПРА ЛЕНІНА РАСКАЗ

КОЖНАМУ паэту і пісьменніку, чый лёс непасрэдна звязаны з лёсам Радзімы, народжанай у агні Кастрычніцкай рэвалюцыі, дорага бессмяротнае імя Уладзіміра Ільіча Леніна. Сваю любоў і павагу да вялікага чалавека яны выказвалі і выказваюць у сотнях, тысячах усхваляваных радкоў паэзіі і прозы. Ува скрасіць яшчэ раз жывое слова аб Ільічу было мэтай літаратурнай канферэнцыі, якая адбылася ў чытальнай зале бібліятэкі. Яна так і называлася — «Пачынаю пра Леніна расказ». Гэтымі словамі з паэмы У. Маякоўскага пачалі выступленне студэнткі філалагічнага факультэта Н. Панчанка і Н. Алейнікава.

На канферэнцыі чыталіся творы М. Горкага, Д. Беднага, Э. Казакевіча, А. Вазнясенскага, А. Безыменскага, А. Суркова і іншых майстроў мастацкага слова. Слушнымі былі выступленні В. Лабко і С. Рабец. Першы расказаў аб Леніне як тэарэтыку літаратуры, аб яго ўплыве на мастацкую і крытычную літаратурную думку; другая — аб тым ідэйным уплыве, які аказваў Уладзімір Ільіч на пралетарскага пісьменніка М. Горкага. «Горкі аб Леніне» было тэмай выступлення студэнткі матфака О. Сіманоўскай. Горача і пранікнёна выступалі на канферэнцыі С. Берднік, О. Пакроўская, В. Макаед, С. Варзобава, Н. Бартнова, Т. Кошачкіна, М. Паўловец і іншыя.

Падрыхтавалі канферэнцыю супрацоўнік бібліятэкі А. М. Рукшын і дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры У. С. Карабан.

А. НАВІНСКІ.

СТУДЭНТЫ ДЫСКУЦІРУЮЦЬ

△ У першакурснікаў біяфака адбыўся цікавы дыспут пад дэвізам «Нас водила молодость в сабельный поход». Супрацоўнік бібліятэкі Т. Ю. Кавалёва, якая праводзіла дыспут, студэнткі Л. Барадаўка, І. Збароўская, С. Купавіна, Т. Злотнік і іншыя расказалі аб мужнасці і стойкасці маладога рэвалюцыйнага пакалення, аб легендарных подзвігах выхаванцаў камсамола ў перыяд грамадзянскай вайны.

△ Другі дыспут на біяфаку — па кнізе С. Дангулава «Ленін размаўляе з Амерыкай» адбыўся ў шостай групе трэцякурснікаў (камсорг О. Скрабіна). На ім выступілі студэнты Скабей, Янчына, Цітова, Шаверда, Чарнабаева і многія іншыя. Гэта мерапрыемства было таксама праведзена супрацоўнікам бібліятэкі А. І. Чырковай.

△ Горача дыскуціравалі і студэнты, якія жывуць у інтэрнаце па Паркавай магістралі. Тут праходзіў дыспут па тэме «Вобраз юрыста ў савецкай літаратуры». Арганізавалі яго супрацоўнік бібліятэкі юрыдычнага факультэта В. П. Ананька і дацэнт філфака У. С. Карабан.

В. АЛЯКСАНДРАЎ

СІМПОЗІУМ ПА ЦЮРКІЗМАХ

У славянскіх мовах, у тым ліку ў рускай і беларускай, ёсць цэлы шэраг слоў цюркскага паходжання. Гэта, напрыклад, такія словы, як **деньги, курган, кафтан, туман, сундук, колчан, арбуз** і многія іншыя. Кожнае з такіх слоў — след пэўных культурных, эканамічных, ваенных, палітычных узаемаадносін паміж носьбітамі славянскіх і цюркскіх моў, паміж славянамі і цюркамі. Яны пранікаюць у славянскія мовы ўжо на працягу тысячагоддзя, а магчыма і больш працяглага перыяду, раскрываючы кантакты цюркскіх і славянскіх народаў. Многія з такіх слоў на славянскай аснове значна змянілі сваю форму, іншыя змянілі значэнне. Слова **балык** стала абазначаць не проста рыбу, як у цюркскіх мовах, а «асоба прыгатаваную частку рыбы». Не адразу можна пазнаць цюркізм у беларускай дыялектнай назве ястраба-перапёлетніка—**караголь** (магчыма, з **кыргый**).

Для кожнай славянскай мовы ёсць свая асобая праблематыка цюркскіх элементаў. Так, рускія жывуць у непасрэдным кантакце з многімі цюркскімі народамі (татарамі, башкірамі, чувашамі, казахамі, нагайцамі і іншымі на Усходзе і на Поўдні), беларусы ж і палякі мелі з цюркамі непасрэдныя кантакты ў мінулым, калі польская і літоўская дзяржавы ўступалі ў розныя адносіны з Крымам, а пазней — толькі з невялікімі цюркскімі групамі —карамамі і «літоўскімі татарамі». Гэта накладвае своеасаблівы адбітак на састаў і характар цюркізмаў у беларускай мове, многія з якіх прыйшлі ў беларускую з рускай або з украінскай моў. Ёсць нямала і іншых спецыфічных пытанняў у вывучэнні цюркізмаў у мовах славянскіх народаў.

Характэрнай асаблівасцю гэтых пытанняў з'яўляецца тое, што вывучэнне цюркізмаў у славянскіх мовах патрабуе супрацоўніцтва прадстаўнікоў розных навуковых спецыяльнасцей, перш за ўсё — спецыялістаў у галіне славянскіх і цюркскіх моў. І цюркалагі, і славісты на працягу апошніх ста год нямала зрабілі для вывучэння цюркскіх элементаў у славянскіх мовах. Некаторыя пытанні аднак застаюцца адкрытымі. Так, напрыклад, мы не знаем надзейных цюркізмаў для праславянскай мовы; а рашэнне гэтага пытання вельмі істотнае для вызначэння тэрыторыі славянскай прарадзімы: была яна ў суседстве з цюркамі ці не. Старажытны цюркскі народ, які жыў на Волзе, — булгары ў першым тысячагоддзі нашай эры перайшлі на Балканы, заваявалі там, відаць, славянскае княства, а пасля прынялі мову заваяваных імі славян — цяперашнюю балгарскую мову. Але як ішлі булгары на Балканы, дзе пакінулі яны свае «сляды» ў выглядзе запазычаных імі славянскіх слоў, — цяжкае і цікавае пытанне. Выказваецца думка аб тым, што, магчыма, некаторыя беларускія словы з'яўляюцца іменна такімі булгарызмамі. Ёсць і яшчэ цэлы шэраг складаных, нялёгкіх для рашэння пытанняў, якія чакаюць старанага і комплекснага даследавання.

Менавіта таму, пачынаючы з мінулага года, па ініцыятыве навуковага савета па праблеме «Заканамернасці развіцця моў сацыялістычных нацый», сталі праводзіцца сімпозіумы аб цюркскіх лексічных элементах у славянскіх мовах. Першы такі сімпозіум праводзіўся ў мінулым годзе ў Маскве. Беларуская мова была прадстаўлена на ім трыма змястоўнымі дакладамі, і правядзенне чарговага сімпозіума было вырашана даручыць нашаму універсітэту.

25 лістапада ў Мінску сабраліся вучоныя з Масквы, Кіева, Львова, Алма-Аты, Душанбе, Вільнюса, Каршы і раду іншых гарадоў, каб абмеркаваць чарговыя праблемы вывучэння цюркізмаў ва ўсходніх і заходніх славянскіх мовах. Сярод іх — вядомыя цюркалагі і славісты прафесары Н. А. Баскакаў, В. Д. Аракін, А. К. Антановіч, В. І. Філоненка, спецыялісты ў галіне цюркізмаў у славянскіх мовах І. Г. Дабрадомаў, Э. Н. Кушліна, Р. В. Болдыраў і іншыя. У сімпозіуме прымаюць актыўны ўдзел, выступаючы на ім з дакладамі, прафесары і выкладчыкі нашага універсітэта — М. Г. Булахаў, К. М. Гулумянц, Б. Ю. Норман і іншыя, а таксама навуковыя супрацоўнікі Беларускай акадэміі навук М. В. Бірыла, А. І. Жураўскі, В. В. Мартынаў, Р. В. Краўчук, А. М. Булыка і іншыя.

На працягу трох дзён на сімпозіуме абмяркоўваліся і агульныя даклады, прысвечаныя лёсу цюркізмаў у асобных славянскіх мовах, і даклады, прысвечаныя цюркізмам у розных помніках пісьменнасці або ў беларускіх «кітабах», пісаных арабскімі літарамі. Асобнае пасяджэнне сімпозіума было прысвечана цюркізмам, якія зафіксаваны ў рускіх і беларускіх прозвішчах, а таксама назвам геаграфічных аб'ектаў і народаў.

Важнае месца ў рабоце сімпозіума заняло абмеркаванне праблематыкі слоўнікаў цюркізмаў у славянскіх мовах. Маецца на ўвазе, што такія слоўнікі, да складання якіх ужо можна прыступіць, абагуляць тую вялікую даследчую работу, якую зрабілі вучоныя у гэтым напрамку. Відавочна, і наш універсітэт разам з Беларускай акадэміяй прыме ўдзел у складанні слоўнікаў цюркізмаў беларускай мовы.

Сімпозіум, прысвечаны вывучэнню цюркізмаў, з'явіўся значнай падзеяй не толькі ў жыцці філалагічнага факультэта, але і ўсіх мованаведаў Мінска. Несумненна, ён стане значнай вяхой у вывучэнні цюркізмаў у мовах славянскіх народаў.

А. СУПРУН,
загадчык кафедры агульнага мовазнаўства, прафесар.

АД МІНСКА ДА ШУШАНСКАГА

100

(Працяг. Пачатак у № 33).

УСЁ ДАЛЕЙ, УСЁ НОВЫЯ МЯСЦІНЫ

Роўненькім шнурочкам — спераду здаецца, быццам не сем, а адна машына — ідзе калона. На колы наматваюцца ўсё новыя і новыя кіламетры. Трапечацца сцяг на галаўной машыне, якую вядзе У. Белакосаў. Маляўнічае афармленне калоны кідаецца ў вочы. Вітаюць праходзячыя, «салютуюць» сігналамі сустрэчныя машыны. Нагружаны цяжка, але хуткасць трымаецца ўпэўнена: 80—100 кіламетраў у гадзіну...

Малады, імклівa растучы Тальяці. Тут ніколі не быў Ленін. Ды і гэтага горада ў той час не было. Але толькі ў нягаснучым святле ленінскага вучэння растуць у нашай краіне такія гарады. Магнітагорск, Камсамольск, Ігарка, Светлагорск, Дзяржынск — усе яны з'явіліся і расцвілі ў пераможныя гады Савецкай улады. У 1964 годзе на карце ўзнік яшчэ адзін горад — Тальяці. У гутарцы з сакратаром гаркома камсамола ўдзельнікі экспедыцыі даведаліся шмат цікавага. Ужо ў 1970, юбілейным годзе, уступіць у лік дзеючых Волжскі аўтамабільны завод. Перспектывы яго велічныя: 2 тысячы аўтамашын у суткі, 660 тысяч у год — столькі машын не выпускае ні адзін сучасны завод. Кожны аўтамабіль будзе сыходзіць з канвеера, даўжыня якога 2,5 кіламетра, праз 22 секунды. На 16 кіламетраў працягнуцца ўсе астатнія дапаможныя канвееры. Гэтае будаўніцтва ўключана ў лік усесаюзных ударных камсамольскіх. З 240-тысячнага насельніцтва горада — 7 тысяч камсамольцы, якія працуюць на будаўніцтве. Ёсць тут і пасланцы Беларусі. Для маладых будаўнікоў — добра ўпарадкаваныя інтэрнаты, чатыры стадыёны, яхтклуб.

Удзельнікі паходу ўвечары былі запрошаны на міжнародныя спаборніцтвы па мотакросу.

АСАБІСТА ВЕДАЛІ ЛЕНІНА

Упершыню Ленін прыехаў у Самару ў 1889 годзе. Пасяліўся на вуліцы Стралецкай. З цяжкасцю атрымаўшы дазвол, ён экстэрнам здае экзамен за юрыдычны факультэт пры Пецярбургскім універсітэце. Экзаменаваліся тады 33 чалавекі. Але вышэйшыя адзнакі па ўсіх прадметах былі выстаўлены толькі аднаму Ульянаву. Яму выдалі дыплом першай ступені. У Самары Уладзімір Ільіч працаваў адвакатам, выступаючы абаронцам інтарэсаў сялян і рабочых. Тут Ленін глыбока вывучае марксізм. У 1893 годзе ён піша першую навуковую працу. Цяпер у Куйбышаве адкрыт музей У. І. Леніна.

Асабліва запомніўся горад удзельнікам экспедыцыі сустрэчамі з цудоўнымі людзьмі, якія асабіста ведалі Уладзіміра Ільіча. Адзін з іх — Іосіф Арсенцьевіч Рамянчук, член партыі з 1917 года. Ён быў у той час сакратаром партбюро завода «Красный богатырь». У лютым 1918 года І. А. Раманчук быў з дэлегацыяй у Леніна па пытаннях харчавання.

— Няма хлеба, Уладзімір Ільіч, і ў рабочых расце незадавальненне, — сказаў Раманчук. — Што будзем рабіць?

Ленін, вельмі стомлены, пільна паглядзеў у вочы, уздыхнуў. Сказаў, што ведае аб гэтым становішчы, што прымаюцца самыя неадкладныя меры. І трэба паўсюдна растлумачваць рабочым сутнасць становішча, гаварыць самую праўду. І рабочыя, безумоўна, зразумеюць...

На працягу чатырох год Раманчук неаднаразова сустракаўся з Леніным, высвятляючы розныя неадкладныя партыйныя пытанні. Размаўляў па тэлефоне. Успомніў Іосіф Арсенцьевіч і пра такі выпадак. Аднойчы ён дзяжурыў у Массавце. Зазваніў тэлефон. Уладзімір Ільіч папрасіў знайсці сакратара Маскоўскага гаркома партыі. Праз некаторы час Уладзімір Ільіч пазваніў зноў і паведаміў, што патрэбнага чалавека ён знайшоў сам і няхай Іосіф Арсенцьевіч не турбуецца.

У сям'і І. А. Раманчука падарожнікі правялі шмат гадзін і даведаліся аб многіх цікавых падзеях, удзельнікам якіх быў сам гаспадар дома. Дарэчы, Іван Арсенцьевіч доўгі час працаваў у Мінску, быў дырэктарам музея Рэвалюцыі, дырэктарам інстытута гісторыі партыі.

ГОРАД НА СЯМІ ЎЗВЫШШАХ

Уфа бачна здалёк. Яна, як Кіеў і Рым, размешчана вельмі своеасабліва: на сямі вялізных узвышшах. За дзесяткі кіламетраў відаць і факелы ні днём ні ноччу не затухаючага агню. Тут буйнейшы ў краіне завод па перапрацоўцы нафты.

У горадзе У. І. Ленін быў два разы, аб чым сведчаць экспанаты гарадскога музея Уладзіміра Ільіча. У будынку, дзе цяпер музей, доўгі час жыла пасля вяртання з Шушанскага Н. К. Крупская, у якой не закончыўся тэрмін ссылкі. З гонарам успамінаў аб гэтым стары бальшавік, член партыі з 1918 года М. Д. Платуноў. Міхаіл Данілавіч, былы матрос крэйсера «Расія», быў дэлегатам ад Балтфлота на гістарычным II Усерасійскім з'ездзе Саветаў.

М. Д. Платуноў многа расказваў удзельнікам экспедыцыі «Іскра» аб сустрэчы з Леніным, аб сваім баявым і працоўным шляху.

У горадзе шмат цікавага. Пабывалі ў музеі А. Матросава, убачылі помнік С. Юлаеву, легендарнаму башкірскаму герою, паплечніку Пугачова.

Надвор'е зноў спрыяльнае. Кожны дзень праходзілі звыш 500 кіламетраў. Начлег — не праблема: або ў лесе, або ў вёсцы. Не было яшчэ ніводнай аварыі.

ПА ЗАХОДНЯЙ СІБІРЫ

Усё было добра да гэтага часу. Пройдзена ўжо значная частка шляху. У кожным горадзе, у кожнай вёсцы следапытаў прыветліва сустракалі. У вялікіх гарадах ужо чакалі пісьмы і тэлеграмы ад сяброў, беларускія газеты з матэрыяламі аб экспедыцыі «Іскра».

Сапраўдныя падарожныя цяжкасці пачаліся за Уралам.

...Златауст, Курган, Петухова — рэдкія гарады Заходняй Сібіры. Тайга. Густыя хвойныя лясы мяжуюць са светлымі гаямі прыгажунь-бяроз. А палі — быццам стэп. І пыл, пыл... Густы, чорны, удушлівы. Засцерагаючыся ад яго, трэба было надзяваць спецыяльныя марлевыя маскі.

За Курганам пачаліся дажджы. Цэлымі днямі, не спыняючыся ні на хвіліну, то праліўныя, то нудныя, быццам восенню.

Пыл ператварыўся ў вязкую чорную гразь. Пачаліся сур'ёзныя паломкі. Хадасевіч і Парфёнаў засталіся ў Чалябінску рамантаваць машыны. Белакосаў пашкодзіў нагу і з цяжкасцю кіраваў машынай. А кожная хвіліна на ўліку.

Прабівацца па гразі далей, цягнуць матацыклы на сабе ўжо няма сіл. Спыніліся на начлег. Дваіх яшчэ няма. Дзе яны?

Дождж не сціх і на наступны дзень. Да вечара прайшлі яшчэ 30 кіламетраў. Зноў ноч, халодная і сырая.

Яшчэ праз дзень Э. Хадасевіч і Ю. Парфёнаў дагналі калону на «ЗІЛе». Вырашылі далей рухацца на грузавіку. Матацыклы пагрузілі ў кузаў. А машыну час ад часу выносілі на руках. Нарэшце дождж спыніўся. Але дарога па-ранейшаму амаль непраходная. А тут яшчэ скончыліся прадукты. На абед — балотная вада з цукрам.

Вечарам пападалі каму дзе давядзецца ў кузаве. Адпачывалі... Зранку — усё спачатку. Шосты дзень такой дарогі. 60 кіламетраў, якія засталіся да асфальта, машыну цягнуў трактар.

У Петрапаўлаўску прывялі да парадку машыны. Адпачылі. Пазнаёміліся з жыццём гарадской камсамольскай арганізацыі. Тут 32 юбілейныя камсамольскія будоўлі, і большасць з іх ужо выканала пяцігадовы план.

Далей дарога пралягла на Омск. Неўзабаве — зноў дождж і дождж. Па-ранейшаму рухаліся прасёлачнай дарогай. Не цягне, задыхаецца матор. Правільна сказаў неяк Серада: «Там, дзе канчаецца асфальт, пачынаецца дарога»...

Нарэшце прыбылі ў Омск. Цяпер гэта горад хімікаў. Навокал непраходная тайга. Кажуць, можна прайсці сто і больш кіламетраў і не сустрэць чалавека. Непадалёку ад Омска, у вёсцы Любшына, нядаўна перайменаванай у вёску Стрэльнікава, нарадзіўся герой вострава Даманскі Іван Стрэльнікаў.

Удзельнікі экспедыцыі «Іскра» сустрэліся з бацькам Стрэльнікава Іванам Мацвеевічам, пажылым ужо, сівым, але не зломленым горам. Ён многа расказваў пра сына.

Зараз заставу, якая носіць імя героя Савецкага Саюза Івана Стрэльнікава, узначальвае па асабістай просьбе яго дваюрадны брат Сяргей Андрэевіч Стрэльнікаў.

З ЗАПІСНОЙ КНІЖКІ КІРАЎНІКА ПАХОДУ

Восем дзён у дарозе. Да Шушанскага яшчэ больш тысячы кіламетраў. Хутка Новасібірск. Там рыхтаваліся да сустрэчы, але мы з-за непраходных дарог ужо намнога выбіліся з графіка.

Новасібірск — адзін з дзесяці гарадоў краіны, насельніцтва ў якіх перавышае мільён.

Пазнаёміліся мы з сусветна вядомым навуковым цэнтрам — Акадэмгарадком. Ужо ў апошні дзень наведалі дзіцячую матэматычную і фехтавальную школы. Вельмі цікава...

У АБДЫМКАХ ТАЙГІ

Тайга, тайга... Суровая, непраходная і велічная. Звонкія ёлкі і піхты — быццам гулкія струны. Густыя зараснікі невядомых кустоў. Уздоўж дарогі месцамі відаць сляды мядзведзя, напэўна, на золаку тут праходзіў лясны гаспадар. Дождж няма, і дарога па лесе нядрэнная. Далей яна ўецца ўздоўж Енісея. На шляху — Дзіўнагорск. Сапраўды дзівоснай прыгажосці мясціны!

Чароўны далягляд адкрываецца з вышыні: зарослыя непраходным лесам прасторы, зрэдку, як востраў, крутая скала. Паветра тут незвычайна празрыстае, і лясныя далі вельмі далёка праглядаюцца навакол. Быццам павуцінне, серпанцін рэдкіх дарог. Блакітная стужка Енісея — удалечыні. А недзе вельмі далёка, ледзь бачна, рака перагароджваецца плацінай Краснаярскай ГЭС.

Удзельнікі паходу пабывалі і там, на будаўніцтве гідраэлектрастанцыі.

Пры ўездзе ў Краснаярск экспедыцыю ўжо чакалі прадстаўнікі камітэта камсамола. Адбылася ўрачыстая, хвалюючая сустрэча, а пасля — экскурсія.

У. І. Ленін у Краснаярску жыў некалькі месяцаў па шляху ў Шушанскае. Сустракаўся і гутарыў з мясцовымі і ссыльнымі сацыял-дэмакратамі. Знаёміўся з іх дзейнасцю, цікавіўся становішчам рабочых. І як заўсёды і ўсюды, многа працаваў у бібліятэках. Праездам ён спыняўся тут яшчэ некалькі разоў.

Аб гэтым сведчаць матэрыялы двух ленінскіх музеяў, што адкрыты ў горадзе. Знаёмства з імі папоўніла запас матэрыялаў беларускіх следапытаў аб жыцці і дзейнасці правадыра.

Цяпер застаўся апошні пераход да месца фінішу. Да яго імкнуліся прыбыць як мага хутчэй многія каманды гарадоў краіны. Праехалі Абакан. Да Шушанскага — 500 кіламетраў.

ШУШАНСКАЕ

Якое ж яно, ленінскае «Шу-шу»? Звычайнае. Тады, пры Леніне, гэта было забытае сібірскае сяло, якое налічвала ўсяго 256 двароў. І ў гэтым сяле Ільічу давялося амаль тры гады пражыць удалечыні ад кіпучай рэвалюцыйнай барацьбы, ад таварышаў з 1897 года па люты 1900 года. Пасяліўся ён тады ў доміку Зыранавых, пабудаваным яшчэ ў 1848 годзе. Цяпер тут адкрыт музей.

За час ссылкі ў Шушанскім Уладзімір Ільіч напісаў больш 30 буйных твораў. Сярод іх «Развіццё капіталізму ў Расіі». У гэты ж час У. І. Ленін вывучаў замежныя мовы і пільна сачыў за падзеямі ў краіне, падтрымліваў цесную сувязь з расійскім пралетарыятам.

У 1898 годзе да Леніна прыехала Н. К. Крупская з маці. Яны пасяліліся ў доме Пятровых. На новую кватэру перанеслі з сабой 15 пудоў кніг (а Леніну забаронена было карыстацца якой бы то ні было літаратурай).

З хваляваннем аглядзелі ўдзельнікі экспедыцыі абодва ленінскія музеі, зазнялі апошнія кадры кінафільма.

Зараз Шушанскае — добраўпарадкаваны сучасны гарадскі пасёлак. Ёсць выдатны Палац культуры, тэхнікум, некалькі кінатэатраў. Так непазнавальна змянілася сяло за гады Савецкай улады.

Наведалі возера Пярова, любімае месца адпачынку Ільіча. Там ён неаднаразова паляваў.

А вечарам па традыцыі турыстаў — касцёр. Член партыі з 1917 года В. П. Тронеў расказаў прысутным аб сустрэчах з правадыром. Ён двойчы сустракаўся з Леніным у 1918 годзе — па пытаннях аб паліве і замежным капітале. Удзельнічаў В. П. Тронеў на VIII Усерасійскім з'ездзе Саветаў, на якім быў зацверджаны план ГОЭЛРО, расказаў і аб гутарцы з англійскім пісьменнікам-фантастам Уэльсам.

Наступны дзень — падвядзенне вынікаў. На фініш прыбылі 12 каманд. Стартавалі 14. Адзначан поспех беларускіх турыстаў. Яны сабралі багаты і разнастайны матэрыял, прайшлі і самы далёкі шлях да фінішу «Іскры». У залік былі ўключаны дасягненні ў спартыўных турысцкіх спаборніцтвах. У выніку — агульнае другое месца.

ЗЛЁТ БЕЛАРУСКІХ ТУРЫСТАЎ

Экспедыцыя закончана. Ззаду засталося 9 500 кіламетраў шляху, 2640 населеных пунктаў — гарадоў і сёл.

У Абакане пагрузіліся на поезд. Пад манатонны стук колаў праляталіся дні і ночы. Дамоў, дамоў...

Упершыню з'явіўся свабодны час. Нават з рэштай. Кіраўнік падарожжа У. Белакосаў з камісарам М. Яшкіным прывозілі да парадку запісы, дарожныя блакноты. Усяго правялі 11 гутарак аб Леніне. Наведалі 26 ленінскіх музеяў. Прачытана 37 лекцый аб ардэнаноснай Беларусі. Прынялі ўдзел у будаўніцтве двух мемарыяльных цэнтраў. Сабраны матэрыял будзе выкарыстаны на занятках па гісторыі. Два месяцы працягвалася цікавейшае падарожжа.

А ў Мінску спыніліся ўсяго на 15 хвілін. Кароткае спатканне. Далей — у Гродна.

Там удзельнікаў экспедыцыі сустракалі дэлегаты II рэспубліканскага злёту турыстаў.

Увечары — «з карабля на баль» — да турысцкага кастра.

Права запаліць касцёр прадастаўляецца ўдзельнікам экспедыцыі «Іскра», якія прайшлі па ленінскіх месцах.

Скупыя словы рапарту кіраўніка экспедыцыі рэспубліканскаму злёту.

...Полымя скача па сухіх галінках, выгінае іх. Турысты садзяцца вакол кастра. Слухаюць расказ удзельнікаў экспедыцыі.

...А ў небе — паспеўшыя буйныя зоркі зрываюцца ўніз. Высякаюць з алмазнай сінявы ночы іскры; з іх разгараецца ранішняя зорка.

В. ФЕРАНЦ,
студэнт.

На здымках (зверху ўніз):

● Цяжка даецца кожны кіламетр дарогі.

● Бацька героя падзей на востраве Даманскі Іван Мацвеевіч Стрэльнікаў расказвае пра свайго сына.

● Макет парахода «Святой Николай», на якім У. І. Ленін 30 красавіка 1897 г. з прыстані Краснаярск выехаў у г. Мінусінск для адбыцця ссылкі ў сяле Шушанскім.

● Стары камуніст І. А. Раманчук (трэці справа) з дачкой Юліяй, былой удзельніцай Мінскага падполля, яе мужам М. П. Марозавым, зведаўшымі жахі Асвенцыма і Бухенвальда, і ўнукамі.

Фота **У. Белакосава.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

...І НА САМАЙ КАРОТКАЙ ХВАЛІ

Мы ў эфіры

ПРОБА СІЛ

Падведзены вынікі вучэбнай практыкі студэнтаў другога і трэцяга курсаў груп радыё- і тэлежурналістаў. Студэнты другога курса пераважна працавалі ў рэдакцыях заводскага і раённага радыё, студэнты трэцяга курса праходзілі практыку ў рэспубліканскім і абласных камітэтах па радыё і тэлебачанню. Як і намячалася, за час вучэбнай практыкі нашы студэнты пазнаёміліся з арганізацыяй і планаваннем работы ў рэдакцыях радыё і тэлебачання, атрымалі першыя навыкі па рэдагаванню, падрыхтоўцы і выпуску радыё- і тэлеперадач.

Мантаж плёнкі, тэхніка запісу жывой мовы на магнітафон, удзел у рэйдах і лятучках, у падрыхтоўцы і выпуску радыё- і тэлеперадач, падрыхтоўка аўтарскіх і асабістых матэрыялаў розных жанраў — усе гэтыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі будучых радыё- і тэлежурналістаў.

Кафедра лічыць, што найбольш арганізавана прайшла практыка ў студэнтаў другога курса — першая іх практыка ў рэдакцыях радыё. Яна ацэнена толькі выдатнымі і добрымі адзнакамі. Выдатна атрымалі Г. Адамсон, Л. Ляскова, З. Дабрынеўскі, В. Царэнка, С. Багушэўская, А. Дамарацкі, Л. Шапіра, Н. Цімафеева і іншыя.

Студэнты трэцяга курса адпаведна з вучэбным планам выканалі больш шырокі аб'ём работ. Многія іх матэрыялы атрымалі станоўчыя водгукі ў калектывах рэдакцый. Гэта работы А. Аўчарэнкі, В. Ваявоцкага, В. Новаша, І. Клыгі і іншых.

Практыку праходзіў з 12 ліпеня па 4 жніўня на студыі Рэспубліканскага тэлебачання. Адразу заўважу, што на тэлебачанні я практыку праходзіў упершыню. Гэта ў нейкай меры ўплывала на якасць і колькасць матэрыялаў. Шмат часу патрабавала знаёмства са студыяй. Гуказапіс, мантаж відыяплёнкі быў амаль невядомы. Роля рэжысёра, аператара ў перадачах ўяўлялася мной неакрэслена. Таму адразу з прыходам у маладзёжную рэдакцыю па магчымасці імкнуўся пазнаёміцца з «кухняй» тэлеперадачы. Мне пашанцавала: на другі ж дзень атрымаў дазвол ехаць са здымачнай групай, каб зрабіць цыклавую перадачу «Дарогамі бацькоў-герояў». У перадачы расказвалася аб гісторыі, людзях беларускага сяла Языль, што ў Старадарожскім раёне. Роля мая была невялікай, але шэсць дзён камандзіроўкі пазнаёмілі мяне са здымкамі па падрыхтаванаму сюжэту.

Г. ЗЯНЬКОВІЧ.

БЫВАЕ І ТАК

Гэта быў нават не дзень практыкі, а, хутчэй, дзень барацьбы — барацьбы студэнтак журфака, з аднаго боку, і прадстаўнікоў маторнага — з другога.

Н. СТРЫЖАК.

МОЙ ТРЭЦІ РЭПАРТАЖ

Сваю трэцюю вучэбную практыку я праходзіла ў маладзёжнай рэдакцыі беларускага рэспубліканскага радыё. За 20 дзён практыкі падрыхтавала сем матэрыялаў. Калі ўлічыць, што я працую марудна і кожнаму матэрыялу папярэднічае доўгі падрыхтоўчы перыяд, то гэта для мяне даволі здавальняюча. І наогул, я «выседжваю» свае матэрыялы, як курыца яйкі, але ад гэтага яны, на жаль, ніколькі не выйграюць.

У час падрыхтоўчага перыяду ў маёй галаве роіцца многа варыянтаў будучых перадач, але варта толькі сесці за стол, узяць ліст паперы, як усе мае творчыя ўяўленні і фантазіі знікаюць. Больш за ўсё клопатаў прынёс рэпартаж аб уступных экзаменах у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Гэты рэпартаж быў маёй самай цікавай работай. Я сустрэла там многа цікавых людзей, што мяне глыбока ўразіла. Адны з іх былі адданы тэатру сур'ёзна, іншыя проста вырашылі паспрабаваць свае сілы. Зрабіць рэпартаж. Здавалася б, што можа быць прасцей! Але ў мяне тут не абышлося без прыгод. Я хадзіла на ўсе консультацыі ў тэатральны: хацелася бліжэй пазнаёміцца з абітурыентамі. Консультацыі — гэта свайго роду тэарэтычны конкурс. Вядзе іх выкладчык, які набірае майстэрню, і менавіта тут, на консультацыі, ён адбірае сабе вучняў. З-за свайго росту я знешне была падобнай на абітурыентку. Я ўвайшла ў гэтую ролю і некалькі разоў лавіла сябе на тым, што мяне сур'ёзна цікавяць пытанні: колькі чалавек прымаюць, колькі ў іх дзяўчат і г. д.

Абітурыенты адчулі мяне сваёй, раіліся са мной і давалі парады, што чытаць, нават спрабавалі выявіць маё амплуа. Тым часам я паціхеньку накаплівала матэрыял. Але вось аднойчы мяне «раскрылі». На адной з кансультацый Юрый Сідараў, выкладчык, які набіраў у гэтым годзе курс, уважліва паглядзеў на мяне і папрасіў што-небудзь пачытаць. Я паспрабавала адмовіцца, але ён прыкрыкнуў на мяне, і мне давялося ісці чытаць. Чытала я многа. Потым ён запісаў маё прозвішча сабе ў блакнот і сказаў, каб я заўтра была на кансультацыі. А на наступную кансультацыю прыйшоў Ілья Львовіч Курган. Я адчула небяспеку выкрыцця і ціхенька сядзела на апошнім радзе. Але мая інтуіцыя не падвяла мяне і тут. Сідараў раптам прашаптаў штосьці Кургану на вуха і выклікаў мяне. У Кургана вочы на лоб палезлі. «Што-о-о?!. Вы ў тэатральны?.. Ды вы ж з глузду з'ехалі! Кідаць чацвёрты курс журфака і ісці сюды». Даводзіў да розуму ён мяне мінут 20. Ад сораму я ледзь стрымлівала слёзы. Я праклінала свой рэпартаж і наогул журналістыку. А Курган схапіў мяне за руку і павёў у прыёмную камісію забіраць дакументы. З цяжкасцю мне ўдалося растлумачыць, чаму я тут апынулася. На кансультацыях я больш не з'яўлялася. Але паколькі запісу я не зрабіла, то вырашыла пайсці прама на экзамен па майстэрству. У інстытут мяне не прапусцілі: на гэта павінен быць дазвол рэктара. Экзамены ўжо пачаліся, і мне давялося сядзець у вестыбюлі і чакаць перапынку. Не дапамагла размова і з камендантам. Загадалі чакаць. Трэба было нешта прыдумаць. Рабяты з трэцяга курса ўзяліся правесці мяне праз выбітае акно. У самы адказны момант, калі рэпарцёр мой быў ужо ў пакоі, а сама я напалову яшчэ на вуліцы, нас «накрыў» камендант. Я разгубілася, але ён, напэўна, яшчэ больш. «Вось гэта, я разумею, журналіст...» — толькі і прамовіў ён. Мы доўга гутарылі з ім «па душы», а ў канцы размовы ён пранікся да мяне сімпатыяй і прапусціў. Запісы ў тэатральным інстытуце атрымаліся выдатныя. Паступаючыя гаварылі цудоўна, так жыва, эмацыянальна, але калі трэба было зрабіць з гэтых запісаў перадачу, я разгубілася. Мне хацелася ўціснуць у рэпартаж як мага больш. Увогуле пасля рэдактарскіх правак засталася адна трэць. Была парушана кампазіцыя. Перадача не ўдалася. Яўна не хапала вопыту. Гэта быў мой трэці рэпартаж.

С. ДУБОЎСКАЯ.

Наступны матэрыял апошні, мая лебядзіная песня — інтэрв'ю з рэжысёрам Кіеўскага тэатра аперэты Арцёмавым.

Л. Ляскова.

Сэрца стала біцца рытмічна, у такт з працуючымі станкамі

З. ШАЎЦОВА.

Што датычыцца ўвогуле радыйных матэрыялаў, дык яны патрабуюць заўсёды шмат часу і ўсялякіх там сіл...

А калі ўзняць раённае радыё на пэўную вышыню — дык яно загаварыла б.

Г. АДАМСОН.

Я ў Рагачове. Аб сваіх уражаннях не пішу, таму што для гэтага трэба змарнаваць шмат паперы. Маг дастаў сёння раніцай.

...Майстар жартаўліва падитурхнуў Сашу па плячу.

Г. ПАДАЛІЦА. (З дзённіка).

Работнікі радыё адразу далі мне адчуць, што я тут не на птушыных правах.

У. Царэнка.

БЫВАЕ І ТАК

(Са справаздач практыкантаў)

Яшчэ разам з Дамарацкім я выконвала абавязкі дыктара і машыністкі.

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Я сядзіўся ля тэлефона і выбіваў інфармацыю.

І. РУСАКЕВІЧ.

У дзень першай перадачы я амаль паўдня сядзела на рэдакцыйнай верандзе і ўголас чытала і перачытвала «Раённыя навіны».

...Прыехала ў рэдакцыю ў 9 гадзін раніцы. Сустрэлі мяне як добрую знаёмую, але настрой адразу сапсаваўся. Рэдактар паехаў да бацькоў, вернецца толькі ў сераду, арганізатар раённага радыё ў Мінску на сесіі, будзе ў рэдакцыі толькі ў ліпені. Мне стала страшна.

Перш за ўсё пайшла ў Дом піянераў. У дварэ трава па калена і, канешне, на замку

Р. ГАЛУБЦОВА.

Хутка я зразумела, што ў мяне гарыць практыка.

І. КЛЫГА.

МАЛ. У. ТРУСАВА.

«КРЫЖАЧОК» І ЯГО ПАДАРОЖЖА

Увогуле гэта была цікавая і карысная паездка. Працягвалася яна, праўда, не так ужо і многа — 10 дзён. Але і за гэты тэрмін удзельнікі народнага ансамбля танца «Крыжачок» пазнаёміліся з жыццём і бытам студэнтаў Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера, расказалі ім аб сваёй вучобе, сваіх клопатах.

Нямецкія калегі былі надзвычай уважлівыя да нас. А яшчэ мы, бадай, усюды адчувалі іх жаданне дапамагчы нам, калі здараліся сякія-такія непаладкі, заўважалі і іх імкненне ўсё зрабіць так, каб нам было прыемна і ўтульна ў іх краіне.

Цяпер наша паездка афармлена падрабязнай справаздачай, абагульнена лічбавым матэрыялам, запісана ў паперах—і такім чынам увайшла ў гісторыю нашага універсітэта яшчэ адной, няхай па-афіцыйнаму скупой, але ўсё ж цікавай старонкай. Але ў кожнага ўдзельніка гэтай своеасаблівай дэлегацыі засталося ў сэрцы нешта большае, чым пералік сустрэч і колькасць выступленняў. Гэта усё ж-такі, як ні кажы, кавалачак жыцця, пэўны прамежак часу, напоўнены хваляваннямі, перажываннямі, нарэшце, ураженнямі. І вось аб усім гэтым, асабліва пра апошняе. І хочацца зараз пагаварыць.

Недакладнасць, дапушчаная ў тэлеграме, якую пасылалі з Мінска ў Іену, для нас, як высветлілася ў Берліне, была выйгрышнай. Аспірант кафедры гісторыі, сакратар сектара культуры Густаў Батке разам са студэнтам II курса філалагічнага факультэта Фолькмарам Гайсікам (дарэчы, цудоўна валодаючым рускай мовай) чакалі нас амаль другія суткі. Зразумела, што і далей праходзіла ўсё належным чынам: арганізацыя як быццам ішла наперадзе на адзін дзень.

Тут жа, на пероне, адбыўся абмен прамовамі. Спачатку гаварыў добрыя словы Густаў Батке, віншуючы нас на нямецкай зямлі, а потым словы ўдзячнасці і вялікіх надзей гаварыў кіраўнік нашай дэлегацыі Г. Я. Рылюк. Мы неяк адразу спадабаліся ветлівым калегам, а тыя ў сваю чаргу нам. Гэта сапраўды былі добрыя і кемлівыя хлопцы—Густаў і Фолькмар.

Мы яшчэ не раз адчуем іх вялікі клопат. Праўда, яны дужа многа гаварылі паміж сабой, удакладняючы план таго ці іншага мерапрыемства, але калі змаўкалі, пагадзіўшыся на нечым адным, станавілася ясна — гэта закон. Так мы на прыватных прыкладах пераканаліся, што немцы сапраўды народ пунктуальны. Праўда, з уласцівай нам памяркоўнасцю, ці лепш сказаць, «цягучасцю», мы даволі часта парушалі гэту славутую пунктуальнасць: нават на паязды ўмудраліся спазняцца. Але гэта між іншым.

Ужо ў Берліне мы добра адчулі, што мэта нашай паездкі ў ГДР значна шырэй, чым проста выступленні на сцэнах тэатраў і клубаў або наведванні гістарычных помнікаў, прывабных мясцін. Істотнае і галоўнае было ў іншым — ці зможам мы перадаць свае шчырыя і моцныя пачуцці даверу і павагі нямецкім таварышам, ці замацуем у адданай дружбе тое настойлівае імкненне да ўзаемаразумення як з нашага, так і з іх боку.

Цяжка гэтыя пачуцці паставаць у Бухенвальдзе, на зямлі, дзе нават да гэтага часу пошукавыя групы адкопваюць тоны попелу. У тонах тых—не адзін дзесятак савецкіх кілаграмаў. Разам з тым нельга насуплена і холадна аднесціся да нямецкага юнака, твайго равесніка, які даверліва кладзе руку на тваё плячо, і ты адчуваеш, як яна часта ўздрыгвае, калі 62-гадовы гід Рыхард Кухарчык, былы вязень фашысцкай турмы, расказвае аб зверствах фашыстаў. (Здымак унізе). Нельга не ўсміхнуцца гэтаму равесніку, які разам з табою (нават, здаецца, больш за цябе) хвалюецца за выступленні нашых рабят на сцэне, турбуецца за цябе, каб ці то ў сталовай, ці то ў аўтобусе табе было добра, каб ты адчуваў сябе як дома. І ўжо зусім расчуліцца тваё сэрца, калі ты бачыш, як, падхапіўшы матыў рускай песні, разам з табою спявае твой нямецкі таварыш.

У пачатку я некалькі іранічна выказаўся наконт нашай арганізаванасці. Увогуле справядлівая заўвага патрабуе тым не менш невялікага ўдакладнення. На выступленнях, там, дзе на кожнага ўдзельніка ўскладвалася асаблівая адказнасць, было ўсё лепей лепшага. У гэтым, відаць, немалая заслуга кіраўнікоў ансамбля «Крыжачок» і аркестровай групы Мікалая Вікенцьевіча Лапшы і Уладзіміра Сяргеевіча Краснаярцава, а таксама Георгія Якаўлевіча Рылюка (калі нікалі ён сядзеў, як «патрыцый», у глыбіні залы на ўзвышшы і такім чынам адразу назіраў і за сцэнай, і за публікай, і, безумоўна, стараўся заўсёды быць аб'ектыўным), Міхаіла Цівы (клапатлівага арганізатара з задаткамі дыпламата) і Васіля Літвінкі (прадзюсера і асвятляльніка).

Звычайна выступленне займала гадзіну і сорак мінут. Ні адзін нумар не праходзіў без апладысментаў. Іх, канешне, выклікалі не толькі пачуцці салідарнасці, а прыгажосць, харство і тая стрыманасць, што так удала вызначала і танцораў, і музыкантаў, і спевакоў. А яшчэ — тонкасць выканання. Гэта ўсё зразумела і гэта ўсё добра.

Цяпер мы дома. Рыхтуемся да новых выступленняў. І тут, на мой погляд, дарэчы будуць такія (можа, і спрэчныя) заўвагі. Наш НАРОДНЫ ансамбль танца «Крыжачок» тэндэнцыйна збіваецца на прафесіяналізм. Элементы запазычанай артыстычнасці, залішняй ускладнёнасці не вельмі ўдала стасуюцца з самабытным малюнкам танца, самой яго прыродай. Нам няма патрэбы пераймаць узоры тэлеэстрады, калі мы сур'ёзна паставілі перад сабой мэту развіваць традыцыйна-народнае мастацтва. Чым вытлумачыць такую з'яву? Мне здаецца, што нашы самадзейныя артысты наблізіліся да той мяжы, дзе арганічна спляліся традыцыя і яе пераўвасабленне. І цяпер, відаць, ідуць фармальныя пошукі менавіта ў гэтым пераўвасабленні. Калі гэта так, то плён будзе не надта багаты.

Вось якія думкі прыйшлі мне за мяжой і якімі я хацеў падзяліцца з нашымі чытачамі.

В. ПОЛЯК.

Фота **В. ГЕРАСІМАВА.**

ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН У СЯБРОЎ

У сувязі са святкаваннем 20-годдзя ГДР адзін з лепшых універсітэцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці — народны ансамбль танца «Крыжачок» выязджаў у горад Іену па запрашэнню кіраўніцтва Іенскага універсітэта. Гэта быў першы студэнцкі калектыў, які пабываў у ГДР. Паездцы папярэднічала працяглая інтэнсіўная падрыхтоўка. Яна дала свой плён: за кароткі час калектыў выступіў з сямю канцэртамі, і ўсе ўдзельнікі з гонарам вытрымалі гэту вялікую нагрузку.

Калі перад першым канцэртам ў горадзе Вайда мы вельмі хваляваліся, не знялі, як прымуць нас гледачы, то пасля, у горадзе Грайц, у горадзе Кале, на двух канцэртах у гарадскім тэатры ў горадзе Іена, двух канцэртах у часцях Савецкай Арміі, хваляванне, дзякуючы цёплай атмасферы ў зале, уціхла.

Неаднаразова нашы нямецкія сябры падкрэслівалі каштоўнасць абмену такімі ансамблямі. «Мова мастацтва — самая зразумелая і даступная для людзей розных нацыянальнасцей», — сказаў на афіцыйным прыёме каменданат горада Вайда.

Надоўга застануцца ў памяці ўдзельнікаў ансамбля сардэчны прыём, цікавыя і шматлікія сустрэчы з нашымі нямецкімі сябрамі.

З адказным візітам у маі 1970 года да нас прыедзе ансамбль імя Макса Рэймана Іенскага універсітэта.

Мы пастараемся зрабіць усё, каб гастролі нашых сяброў у Мінску былі такімі ж прыемнымі.

В. ЛІТВІНКА,
старшыня праўлення студэнцкага клуба.

□ □ □

ПАЛЫМЯНЫЯ ПАСЛАНЦЫ ДРУЖБЫ

Сяброўскі візіт мінскіх студэнтаў-артыстаў з'явіўся сведчаннем цесных сувязей паміж Іенскім і Беларускім універсітэтамі. Гэта стала відавочным у першы ж дзень, калі адбылася ўсхваляваная сустрэча беларускіх і нямецкіх студэнтаў і работнікаў культуры ў маладзёжным клубе «Роза» Саюза свабоднай нямецкай моладзі (СНМ).

Тое, што нямецкія студэнты спявалі рускія народныя песні на роднай мове, а савецкія юнакі і дзяўчаты ахвотна падхоплівалі і спявалі нашы песні на нямецкай мове, з'явілася найлепшым пацвярджэннем таго, што дружба паміж нашымі народамі стала сардэчнай!

У нядзелю мы прысутнічалі на захапляючым канцэрце нашых сяброў у Іенскім гарадскім тэатры. Гэты канцэрт стаў кульмінацыйным і заключным момантам іх знаходжання ў Іене і акрузе Гера, дзе шматлікія выступленні перад насельніцтвам зрабілі іх палымянымі пасланцамі дружбы.

Выступленні ансамбля — танцы, песні, музыкальныя нумары — яскрава сведчаць аб тым, як старанна захоўваюцца багатыя традыцыі беларускага народа. Выразны танец «Камсамольцы 20-х гадоў» — захапляючае харэаграфічнае дасягненне калектыву — прынёс вялікае задавальненне нямецкаму гледачу. Танец выяўляе непахісны аптымізм, гатоўнасць да самаахвяравання, сілу беларускага народа.

Захапляючыя выступленні ансамбля «Крыжачок», якія па сваёй якасці нічым не ўступаюць прафесіянальным, з'явіліся стымулам для нашай уласнай дзейнасці ў галіне рэалізацыі рашэнняў нашай партыі і урада аб пранікненні культуры і мастацтва ў грамадскае і асабістае жыццё грамадзян нашай сацыялістычнай нямецкай дзяржавы.

Сапраўдным дасягненнем ансамбля пры высокім майстэрстве кожнага асобнага танцора з'яўляецца выдатнае музыкальнае суправаджэнне танцаў і песень.

Дні знаходжання ансамбля народных танцаў сталі для нас незабыўнай падзеяй. Сардэчнае дзякуй і да пабачэння!

Аддзел інфармацыі, грамадскай работы і культуры. Універсітэцкае кіраўніцтва СНМ.

Пераклад з нямецкай Бейдзінай.

КАЗАРЫН А.М.

У 1932 годзе А. М. Казарын быў прыняты ў лік студэнтаў Іванаўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, пасля заканчэння якога працаваў выкладчыкам, а пасля дырэктарам сярэдняй школы.

З першых дзён вайны Аляксандр Мікалаевіч пайшоў на фронт. Змагаючыся з ворагам на многіх франтах, ён прайшоў шлях ад камандзіра ўзвода да памочніка начальніка сувязі корпуса. У 1947 годзе закончыў Ваенную Акадэмію сувязі і з той пары пачаў навукова-педагагічную дзейнасць у ваенных вучылішчах і акадэміях краіны. У 1953 годзе А. М. Казарын уступае ў рады Камуністычнай партыі.

Аляксандр Мікалаевіч аўтар больш 60 навуковых работ і вынаходстваў. Ён многа і плённа працаваў па выхаванню маладых выкладчыкаў і навуковых работнікаў.

За заслугі перад Радзімай А. М. Казарын узнагароджан трыма ордэнамі і васьмю медалямі.

Усё жыццё А. М. Казарына было прыкладам вернага служэння Радзіме. Высокай патрабавальнасцю і прынцыповасцю да сябе, да калег па рабоце ён заслужыў павагу ўсіх, хто ведаў яго.

Добрая памяць аб ім назаўсёды застанецца сярод нас.

РЭКТАРАТ,
ПАРТКОМ,
МЯСЦКОМ.

Пасля цяжкай і працяглай хваробы на 57-м годзе жыцця памёр кандыдат тэхнічных навук, старшы навуковы супрацоўнік кафедры радыёфізікі і электронікі нашага універсітэта дацэнт Казарын Аляксандр Мікалаевіч.

Аляксандр Мікалаевіч нарадзіўся ў 1913 годзе ў г. Плаўску Тульскай вобласці. Працоўная дзейнасць яго пачалася рана. Пасля заканчэння сярэдняй школы ён прызначаецца выкладчыкам фізікі і матэматыкі ў той жа школе.

Будзьце асцярожныя на вуліцы!

Вядома, што асновай бяспекі і парадку ў гарадскім руху з'яўляецца дысцыплінаванасць кожнага пешахода, строгае падтрыманне правіл вулічнага руху. Аднак многія ігнаруюць гэтыя правілы, парушаюць іх і становяцца ахвярамі аварый.

За 9 месяцаў гэтага года ў Мінску зарэгістравана 220 аўтадарожных здарэнняў, пры якіх 38 чалавек загінулі і 194 атрымалі розныя цялесныя пашкоджанні. Так, 21 верасня студэнт I курса радыётэхнічнага інстытута А. Сішановіч пераходзіў Партызанскі праспект перад блізка наязджаючым аўтобусам і быў збіты ім. З чэрапнамазгавой траўмай ён быў адпраўлены ў бальніцу. Яшчэ больш цяжкі выпадак са смяртэльным зыходам адбыўся 2 кастрычніка раніцай на скрыжаванні вуліц М. Горкага і Камуністычнай. Студэнт III курса хімічнага факультэта БДУ не звярнуў увагі на светафор і ў выніку атрымаў смяртэльную траўму.

Вечарам 29 кастрычніка студэнтка медінстытута Э. Шут перабягала вуліцу і была збіта аўтамашынай «Волга». Праз дзень на скрыжаванні вуліцы Урыцкага і Ленінскага праспекта выкладчык інстытута замежных моў С. Б. Варашылава ішла на забараняючы чырвоны сігнал светафора і таксама аказалася пад калёсамі аўтамашыны. Дастаўлена ў бальніцу ў цяжкім стане. І зусім нядаўна, 19 лістапада ў 23 гадзіны на вуліцы Ташкенцкай вадзіцель аўтамашыны «Волга» збіў студэнта БДУ А. Шабана, які перабягаў дарогу перад аўтобусам. З сатрасеннем мозгу, сінякамі і ранамі ён быў адпраўлены ў 5-ю клінічную бальніцу.

У нашым горадзе аб пешаходзе клапоцяцца нямала. На скрыжаваннях паяўляецца ўсё больш светафораў, будуюцца падземныя пераходы, трубчатыя агарожы, на аўтамагістралях абазначаюцца «астраўкі бяспекі», вывешваюцца папераджальныя знакі.

Для пешахода правілы руху нескладаныя, і выконваць іх не цяжка.

Перш чым перайсці вуліцу або дарогу, пераканайцеся ў адсутнасці злева ад вас ідучага транспарту, а дайшоўшы да сярэдзіны вуліцы, прапусціце машыны, якія праходзяць справа. Калі рух рэгулюецца светафорам, то дачакайцеся зялёнага сігналу і толькі тады пераходзьце вуліцу. А калі на перакрыжаванні стаіць рэгулявоншчык, то пераходзіць вуліцу трэба толькі тады, калі ён павернецца да вас бокам.

Пераходзьце вуліцу або дарогу толькі ў месцах, абазначаных указальнікамі «Пераход» і па пешаходных дарожках. Там, дзе ўказальнікаў і дарожак няма, пераходзьце вуліцу толькі на скрыжаванні.

Стаячыя аўтамабілі, аўтобусы і тралейбусы абыходзьце ззаду, трамвай — спераду.

Памятайце, што ваша бяспека залежыць ад вас. Давайце зробім усё для таго, каб у нашай сталіцы не было ніводнага здарэння, прычынай якога з'явілася б парушэнне правіл руху.

Будзьце ўважлівыя і асцярожныя на вуліцах!

А. НІЗОЎКІН,
інструктар ГАІ УУС Мінгарвыканкома.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 19066. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1927. Тыраж 2000 экз.